*Грамадска-палітычная газета для жыхароў Бялыніцкага, Круглянскага і Шклоўскага раёнаў*




# Рэгіён

**Чэрвень 2009 г.**

# У прадпрыемства – вялікія праблемы

*ААТ "Шклоўскі масларобчы завод" цягне назад эканоміку Шклоўскага раёна.*



На працягу некалькіх апошніх тыдняў на пасяджэннях Шклоўскага райвыканкама, пры правядзенні так званых "планерак" у старшыні райвыканкама Аляксандра Бойкі, неаднаразова ўзнімаліся пытанні дрэннай працы масларобчага завода.

Прадукцыя прадпрыемства займае больш за 30 % у агульным аб'ёме прамысловай вытворчасці Шклоўскага раёна, яно з'яўляецца лідэрам сярод іншых прамысловых прадпрыемстваў Шклова, далека апярэджваючы іх па гэтаму паказчыку.

ААТ "Шклоўскі масларобчы завод" таксама забяспечвае пераважную частку валютных паступленняў раёна. На малочную прадукцыю прыходзіцца асноўная доля экспарта Шклоўшчыны. За першы квартал гэтага года прадпрыемства прадало за мяжу, пераважна ў Расію, сваёй прадукцыі на 1900,7 тыс. долараў ЗША, што склала 68,4 % ад усяго экспарта Шклоўскага раёна. У мінулым годзе, за аналагічны прамежак часу, прадукцыі было прададзена на суму, меншую ў 1,3 разы.

Здаецца, добрыя паказчыкі, але, на сам рэч, справы выглядаюць зусім па-іншаму. Прадпрыемства даўно патрабуе больш поўнай рэканструкцыі і пераабсталявання, на масларобчым заводзе перапрацоўваецца толькі нязначная частка паступаючага сюды малака. Кожны дзень на завод з гаспадарак і ад насельніцтва завозіцца 170-180 тон малака. З іх непасрэдна на прадпрыемстве выкарыстоўваецца крыху больш 30 тон, а астатнее адпраўляецца на перапрацоўку на іншыя малочныя заводы.

Нельга сказаць, што мясцовыя ўлады не спрабавалі выправіць сітуацыю. Ужо некалькі гадоў таму, з мэтай падвышэння колькасці выпускаемай прадпрыемствам таварнай прадукцыі, на заводзе было разгорнута будаўніцтва корпуса цэха па вытворчасці марожанага. Але сродкаў на працяг будоўлі ўвесь час нехапае, таму недаведзены да ладу аб'ект пачаў ужо пакрыху развальвацца. У мінулым годзе ў тагачасных раённых улад былі вялікія спадзяваннні, што ў развіццё масласыраробчага завода ўкладуць вялікія грошы замежныя інвестары. Справа дайшла да таго, што гэтыя вялікія планы нават агучыў першы намеснік прэм'ер-міністра

*(Заканч. на ст. 2)*

# Нас усё менш

Колькасць насельніцтва нашага рэгіёна імкліва памяншаецца ўсе апошнія гады.

На пачатак 2009 года ў Бялыніцкім раёне пражывала 19,9 тысячы чалавек, што на 2 % менш, чым на пачатак 2008 года. Жыхароў райцэнтра стала на 1 % менш – тут засталося 9,6 тысячы чалавек, - вяскоўцаў паменела на 2,8 %, зараз ў вёсках нашага раёна жыве 10,3 тысячы чалавек.

Згодна афіцыйных статыстычных дадзеных, на пачатку 2007 года ў Бялыніцкім раёне пражывала 21 тысяча чалавек, у 2005 годзе – 23300 (у тым ліку ў г. п. Бялынічы – 10200), сем гадоў таму - 25,1 тысячы чалавек, у 1933 годзе агульная колькасць жыхароў раёна складала 54029 чалавек.

Колькасць насельніцтва Круглянскага раёна па стану на 1 студзеня 2009 года склала 16080 чалавек, з іх у гарадскім пасёлку пражывае 7248 чалавек альбо 45,1 %, у сельскай мясцовасці – 8832 чалавекі (54,9 %). На пачатак 2007 года ў раёне пражывала 16,5 тысячы чалавек, з іх гарадское насельніцтва складала 7,3 тыс. чалавек, сельскае – 9,2 тыс. чалавек. За перыяд з 1999 па 2009 гады гарадское насельніцтва паменшылась на 7,7 %, сельскае – на 21,4 %.

Напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны, у 1940 годзе, у Круглянскім раёне пражывала каля 40 тысяч чалавек.

Насельніцтва Шклоўскага раёна на пачатак года складала 32,1 тыс. чалавек. У горадзе Шклове пражывала 17,8 тыс. чалавек, у сельскіх населеных пунктах – 14,3 тыс. чалавек.

На пачатак 2006 года ў Шклоўскім раёне пражывала каля 33,8 тыс. чалавек, у 2001 годзе – 38 тысяч чалавек.

# У прадпрыемства – вялікія праблемы

*Закканчэнне. Пач. на ст. 1)*

. На прэс-канферэнцыі 1 жніўня 2008 года ён паведаміў, што адна з расійскіх кампаній гатова ўкласці ў стварэнне завода па вытворчасці і перапрацоўцы малака ў Шклове да 80 мільёнаў долараў. “Цяпер вядуцца перамовы з мясцовымі ўладамі на прадмет будаўніцтва там завода па перапрацоўцы малака і пастаўкі прадукцыі на расійскі рынак”, - сказаў тады Уладзімір Сямашка.

На жаль, прайшоў ужо амаль год, мясцовая ўлада памянялась, а пра грандыёзныя планы і вялікія грошы штосьці больш нічога не чуць.

А, між тым, ААТ “Шклоўскі масларобчы завод” ужо ў мінулым 2008 годзе “заваліла” выкананне планаў па вырабу цэльнамалочнай прадукцыі, знізіўшы аб’ёмы вытворчасці на 6,4 %. Яшчэ горшая сітуацыя з пастаўкай прадукцыі прадпрыемства на экспарт, якая знізілась к узроўню папярэдняга 2007 года на 55,2 %. Улада тлумачыла такі вялікі правал тым, што ў лістападзе-снежні 2008 года прадпрыемства не выпускала прадукцыю ў сувязі з правядзеннем рамонтных работ і рэканструкцыяй памяшканняў для вытворчасці.

Але прайшло амаль палова гэтага, 2009 года, рамонтныя работы скончыліся, а прадпрыемства па-ранейшаму не забяспечвае выкананне прагнозных паказчыкаў. Па словах спецыялістаў Шклоўскага райвыканкама, старшыня райвыканкама Аляксандр Бойка правёў ужо некалькі вельмі жорсткіх размоў з дырэктарам масларобчага завода Аляксандрам Ярашэнка. На пасяджэнні райвыканкама 9 чэрвеня 2009 года быў разгледжаны стан спраў на ААТ “Шклоўскі масларобчы завод”, былі заслуханы справаздачы дырэктара Аляксандра Ярашэнка і вядучых спецыялістаў прадпрыемства.

Работа органаў кіравання ААТ “Шклоўскі масларобчы завод” у частцы выканання прагнозных паказчыкаў па таварнай прадукцыі, спажывецкім таварам, задання па рэалізацыі гатовай прадукцыі ў аб’ёме не менш 40 тон у суткі і пошука новых рынкаў збыту прызнана нездавальняючай.

Працягнулася размова 15 чэрвеня на пашыранай нарадзе ў старшыні райвыканкама, дзе быў разгледжаны ход выканання прагнозных паказчыкаў за пяць месяцаў і чакаемае іх выкананне за першае паўгоддзе. Там было адзначана, што шэраг прагнозных паказчыкаў па-ранейшаму не будуць выкананы – спажывецкія тавары, экспарт, тавараабарот, платныя паслугі. Зноў прагучалі словы аб нездавальняючай рабоце ААТ “Масларобчы завод”.

Маю вялікі сумнеў, што прадпрыемства ў бліжэйшы час здолее зняць праблему з выкананнем прагнозных паказчыкаў. Значная частка прадукцыі завода раней прадавалася ў Расію, зараз жа продаж прадукцыі ва ўсходнім накірунку прыпынены цалкам. Хаця афіцыйныя ўлады Расіі і Беларусі аб’явілі аб заканчэнні так званай “малочнай вайны”, але да гэтага часу большая частка малочнай прадукцыі беларускіх прадпрыемстваў пакуль не атрымала дазволу на ўвоз у Расію. На момант напісання матэрыялу (20 чэрвеня), толькі на 140 відаў малочных тавараў 25 беларускіх прадпрыемстваў атрыманы дазвол на ўвоз у Расійскую Федэрацыю. На вялікі жаль, прадукцыі ААТ “Шклоўскі масларобчы завод” у гэтым спісе няма...

Таму заканамерна ўзнікае пытанне, куды ж будуць далей рэалізоўваць малако аграрыі Шклоўшчыны, тым больш, што ўжо ў гэтым годзе ў Шклоўскім раёне плануецца распачаць будаўніцтва яшчэ некалькіх сучасных малочных комплексаў...

Працаўнікі масларобчага завода не вельмі жадаюць распавядаць пра стан спраў на прадпрыемстве. Як адзначыў адзін з іх у прыватнай гутарцы, многія баяцца, што з-за выказанага ўслых меркавання могуць згубіць працу. Новае ж працоўнае месца, дзе б плацілі больш-менш прыстойны заробак, на думку маіх суразмоўцаў, у Шклове знайсці вельмі цяжка. Па словах работніка завода, фінансавы стан прадпрыемства даволі цяжкі, рэальная заработная плата ў апошні час не павялічваецца. Многія рабочыя не разумеюць, навошта прадпрыемству ў гэтыя цяжкія часы, калі фінансавых выдаткаў не хапае на самае неабходнае, яшчэ і свая футбольная каманда, на ўтрыманне якой выкідваецца процьма грошай. Кажуць, што ў падтрымцы гэтай каманды быў моцна зацікаўлены былы старшыня райвыканкама Валерый Іваноў, які зараз прадстаўляе наш рэгіён у Палаце прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

*Іван Барысаў*

Беларуская Інтэрнэт-Бібліятэка
камунікат
www.kamunikat.org

# Древнейшая деревня на Круглянщине

***Впервые она упоминается в XIV столетии как первый на Круглянщине город, центр большой волости, в которую входила и часть современного Белыничского района. Вот так!***

Чем же знаменито самое древнее поселение Круглянского района? Обратимся к историческим источникам. Прежде всего, им управляли люди, имевшие государственный опыт и большую власть. В начале XV столетия Тетерино принадлежало мстиславскому князю Симеону Лугвеню Ольгердовичу, тому самому, который в 1380 году инициировал построение нынешнего Пустынского Свято-Успенского монастыря. В XVI столетии волостью управляла жена князя Великого княжества Литовского Александра, а в первой половине XVII оно перешло под власть канцлера того же Великого княжества Литовского Льва Сапеги. Все они известные люди и все с характером и житейским опытом.

В деревне построили три церкви — Николаевскую, Спасскую, Святой Богородицы, но прошли десятилетия, и к концу XIX века осталась только одна. В конце XVII века монахи Базилианского монастыря создали первую на Круглянщине школу. Потом в Тетерино открылась церковно-приходская школа, после окончания которой можно было сразу поступить в училище. Интересно, что в конце XIX училище и школу объединяют в одно народное училище. К 1901 году почти половина жителей деревни относила себя к иудеям. Работала еврейская молитвенная школа. Ситуация изменилась в годы Великой Отечественной войны. Как известно, фашисты ненавидели евреев и истребляли их.

30 июня 1944 года во время освобождения Тетерино от немецко-фашистских захватчиков погибли 23 бойца. О них теперь напоминает братская могила, а обо всех павших на полях жестокой войны 262 одно-



сельчанах — мемориальный памятник в центре деревни.

Чем еще знаменита деревня? Гидроэлектростанцией, которая находится недалеко от деревни и носит соответствующее название — Тетеринская. Возвели ее в 1955 году. Самое древнее поселение Круглянского района будет жить и славиться своей историей.

*Александр СЕРДЮКОВ*

# Затрыманы адзін з былых падазраваных па “Машчаніцкай справе”

Днямі на шашы Мінск-Магілёў у вёсцы Вялікая Машчаніца Бялыніцкага раёна супрацоўнікі ДАІ Бялыніцкага РАУС спынілі аўтамашыну Форд-Эскорт, звярнуўшы ўвагу на тое, што аўтамабіль не вельмі ўпэўнена рухаўся па трасе. Усалоне аўтамабіля знаходзілася два чалавекі, пры чым за рулём знаходзіўся нецвярозы вадзіцель. У ходзе разбіральніцтва высветлілася, што гэты вадзіцель угнаў аўтамабіль ад аднаго з дамоў у вёсцы Вялікая Машчаніца. Як стала зразумела ў далейшым, угоншчыкам аказаўся адзін з былых падазраваных у забойстве сям’і з шасці чалавек у вёсцы В. Машчаніца, што адбылося ў 2005 годзе, Сяргей Ю. Пад час разбіральніцтва ў Магілёўскім абласным судзе абвінавачванныя па гэтай справе былі апраўданыя за недаказанасцю віны, але атрымалі тэрміны зняволення за іншыя злачынствы. Сяргей Ю. выйшаў на волю па амністыі ў траўні мінулага года і зараз падазраецца ў здзяйсненні іншага злачынства – угоне аўтамабіля. Па словах супрацоўнікаў міліцыі, ён угнаў аўтамабіль без дазволу ў свайго сваяка Д. і за кароткі прамежак часу паспеў яго пашкодзіць. Сяргей Ю. змешчаны ў ізалятар часовага ўтрымання.

Пасажыр аўтамабіля, які знаходзіўся ў машыне разам з Сяргеем Ю., таксама жыхар вёскі В. Машчаніца Алег Ч., адпушчаны да высвятлення абставін справы.

*Сяргей Семяновіч*

## Анекдот дня

Дорогие соотечественники! Мировой кризис обошел нас стороной. Но подкрался сзади именно в тот момент, когда мы наклонились, чтобы поднять упавший рубль!

# Маленький принц

*(Продолжение. Нач. в № 3)*

Но мальчик последовал за президентом в ***Ледовый дворец*** на хоккейный матч президентской команды. Потом буквально через неделю после этого **Александр Лукашенко** с этим же мальчиком появился в ***Гомельской области*** во время поездки по чернобыльским регионам. Вдруг президент в беседе с крестьянами поднял вопрос о своем преемнике: *«Я уже сказал: младший сын будет президентом».* Этим он поставил в тупик экспертов, потому что все подумали на **Диму.** В это время группа британских пиарщиков во главе с **лордом Беллом** взялась за исправление сильно подпорченного имиджа **Лукашенко**, поэтому историю с мальчиком все восприняли как элемент хитроумного плана.

Интригу добавила президентская пресс-служба. На назойливые расспросы журналистов о таинственном мальчике пресс-секретарь президента, как специально, давал идиотские ответы: *«Замечательный мальчик, видел его. Глава государства ему даже икону передал, которую ему подарили. Как-то не поинтересовался, откуда взялся мальчик».*

Сам **Лукашенко** тоже долго играл с журналистами в кошки-мышки. На встрече с большой группой российских журналистов он всех обескуражил: *«А если уже говорить о преемнике, то самого маленького буду готовить в преемники. Уникальный человек. Поэтому подождите, может, мы не дождемся, но другие поколения белорусов дождутся...»* Однако эти тайны тяготили белорусского президента и раздражали белорусское общество. В интервью ***«Комсомольской правде»*** он, наконец, признался, что познакомил младшего сына с **Владимиром Путиным**. *«А все банально — сын, образно говоря, мой хвост. Просто не может остаться ни с кем! Мне, конечно, он нагрузки добавляет, потому что ни одевать, ни кормить его никто не сможет — только я,* — сказал **А. Лукашенко**. — *Что тут скрывать? Это же от Господа Бога! Как же можно о матерях или о детях говорить, что это чужое, это не мое? Это преступление перед* ***Богом.*** *Я приезжал с сыном к* ***Владимиру Владимировичу, Путин*** *мне сказал: ой,* ***Александр Григорьевич****, это же* ***Божий дар****! Дети, говорит, это святое! А для меня — тем более».* После этого признания отцовская любовь президента **Белоруссии** прорвала шлюзы общественных стереотипов поведения.

## Крон-принц

Осенью 2008 года **во время военных учений генералы докладывали уже не только президенту, но и мальчику** Коле**, которому для этого случая специально сшили военную форму. Выход президента страны с внебрачным сыном перед вооруженными силами республики был неоднозначно оценен экспертами. Бывший министр обороны республики генерал** Павел Козловский **назвал участие сына белорусского президента в учениях спектаклем. Но президент на критику давно внимания не обращает.** Коля — **участник почти всех рабочих поездок** Александра Лукашенко **и даже некоторых официальных переговоров. Мальчик участвовал во встрече с президентом** Армении**. На ребенка, правда, не надели пиджак, однако**



*Алесандр Лукашенко и Коля*

**уже одели галстук. Встречу показывали по государственному телеканалу. Окончательно всех умилил визит** Коли **к** Папе Римскому**, которому ребенок подарил букварь русского языка.**

«Можно даже не сомневаться, что в окружении **Лукашенко** просто нет человека, который мог бы сказать ему простую фразу: так нельзя. Даже не потому, что **Коля** внебрачный сын и публичные политики стараются не афишировать такие факты своей биографии. Так нельзя, потому что на наших глазах любящий папа калечит психику ребенка. Четырехлетний мальчик должен ходить в детский сад, заниматься и развлекаться со своими сверстниками, а не играть с малолетства в игру под названием «большая политика» с седовласыми дедами и президентской охраной. Они, может, и неплохие люди, но каждому возрасту — своя компания», — *считает известная белорусская журналистка, шеф-редактор газеты* **«Народная воля»** ***Светлана Калинкина****. Оппозиционные* **СМИ** *открыто обсуждают версии о тайной жизни белорусского лидера.*

*(Окончание в след. №)*

Рэгіён

Грамадска-палітычная газета.
Выдаецца на беларускай і рускай мовах,
распаўсюджваецца бясплатна

Надрукавана на ўласным абсталяванні па адрасе: Бялыніцкі р-н, в. В. Машчаніца. тэл. 37-110. Наклад 299 асобнікаў. Адказны за выпуск Вырвіч Б. І. Падпісана ў друк 21.06.2009 г. у 18.00